www.Belarus-Live.eu

BELARUS Live

NEWSLETTER
06/12-13/12/07

**АФІЦЫЙНА**
▪У Беларусі ствараецца Дэпартамэнт па ядзернай і радыяцыйнай бясьпецы

**ПАЛІТЫКА**
▪Дзень абароны правоў чалавека ў Беларусі

**АПАЗЫЦЫЯ**
▪Зьміцер Хведарук моцна зьбіты

**ГРАМАДЗТВА**
▪Мікалай Чаргінец супраць Аляксандра Тамковіча

**ЭКАНОМІКА**
▪Расея прапануе Беларусі газ па 165 даляраў за тысячу кубамэтраў

**КУЛЬТУРА**
▪Мэдаль Кірылы Тураўскага для Янкі Запрудніка

Двухдзённы афіцыйны візыт у Беларусь У. Пуціна мае на мэце падвесьці своеасаблівую рысу пад усім папярэднім (1991–2007 гг.) пэрыядам беларуска-расейскіх адносінаў. Менавіта так большасьць назіральнікаў схільныя ацэньваць значэньне знаходжаньня 13–14 сьнежня ў Менску расейскага прэзыдэнта. Варта адзначыць, што ў 2007 годзе гэта першая такога кшталту сустрэча прэзыдэнтаў Расеі і Беларусі і што беларуска-расейская інтэграцыя ў выглядзе Саюзнай дзяржавы зьяўляецца адным з тых нешматлікіх пытаньняў, якія прэзыдэнт Расеі пакуль ня змог давесьці да канца.

Мабыць, стаміўшыся ад спробаў адгадаць сапраўдныя матывы й мэты цяперашняга візыту Пуціна ў Менск, як некаторыя расейскія, так і некаторыя беларускія аналітыкі лічаць, што ніякіх сэнсацыяў вынікі менскай сустрэчы не прынясуць. Пераконваюць, што гэта звычайны, плянавы візыт У. Пуціна. Аднак паклоннікі пуцінскіх сюрпрызаў, якія гаспадар Крамлю ўмее рабіць, маюць іншыя настроі. На іх погляд, пытаньне будзе пастаўлена рэбрам: альбо Беларусь і Расея прымаюць рашэньне пра завяршэньне саюзнага будаўніцтва і абвяшчаюць пра правядзеньне рэфэрэндуму, на які выносіцца пытаньне падтрымкі грамадзянамі дзьвюх нашых краінаў праекту Канстытуцыйнага акту, альбо Расея выходзіць з саюзных дамоўленасьцяў і пачынае будаваць зь Беларусьсю строгія і рэальныя рынкавыя адносіны (з захаваньнем раней азначанага расейскім кіраўніцтвам пераходнага пэрыяду ў галіне аплаты Беларусьсю энэрганосьбітаў). Рашэньне наконт першага ці другога варыянту разьвіцьця беларуска-расейскіх адносінаў і будзе прынятае расейскім кіраўніцтвам па выніках сьнежаньскай сустрэчы ў Менску.

Калі ж падчас сустрэчы Лукашэнкі з Пуціным ніякага прарыву дасягнута ня будзе, то Беларусь чакае сцэнар, у якім краіна толькі на нейкі час зможа захаваць палітычны сувэрэнітэт, але пад уплывам эканамічных фактараў яго хутка згубіць. У прадчуваньні менавіта такога стану беларускі бок паспрабаваў папярэдзіць і прадухіліць магчымасьць жорсткай размовы ў Менску з боку расейскага кіраўніцтва, зарганізаваўшы ўцечку інфармацыі ў сусьветныя СМІ.

Нельга зусім выключаць і такіх магчымых наступстваў візыту Пуціна, як узбуджэньне рознага кшталту настрояў і ілюзіяў у пэўнай часткі беларускай намэнклятуры.

Важным фактарам, які здольны паўплываць на ўнутрыпалітычную сытуацыю ў Беларусі, можа быць меркаванае павышэньне ў 2008 годзе кошту паслуг жыльлёва-камунальнай гаспадаркі на 20 даляраў. Але як яно будзе на самой справе, будзе залежаць ад таго, пра які кошт на расейскі газ на наступны год дамовяцца. Аднак і ўмовы пастаўкі нафты зьмяняюцца ў горшы бок, таму насельніцтву прыйдзецца плаціць усё больш. Сьведчаньнем гэтага можа служыць упарадкаваньне, а дакладней, ліквідацыя сацыяльных ільготаў. Акрамя таго, у сьнежні мы назіраем рост кошту праезду ў транспарце. Нагрузка на насельніцтва далей будзе толькі ўзрастаць.

Паводле дадзеных дасьледаваньня, праведзенага Інстытутам прыватызацыі і мэнэджмэнту (ІПМ), удзельная вага выдаткаў на прадукты і жыльлёва-камунальныя паслугі за 1996–2006 гады ў Беларусі склала адпаведна 56,6 і 8,9% ад спажывецкіх выдаткаў 20% найбяднейшых хатніх гаспадарак і 45,7 і 5,1% — ад спажывецкіх выдаткаў 20% найбольш заможных. Пры гэтым за пазначанае дзесяцігодзьдзе цэны на прадукты харчаваньня вырасьлі ў краіне ў 136 разоў (!), на паслугі ЖКГ — у 453 разы (!), на нехарчовыя тавары — у 72 разы (!).

Рэальнай рухаючай сілай неабходных пераменаў у Беларусі павінны зрабіцца індывідуальныя прадпрымальнікі. Нягледзячы на рэпрэсіі, праведзеная ў цэнтры Менску 10 сьнежня акцыя пратэсту з удзелам 1000 бізнэсмэнаў, нязгодных з дыскрымінацыйным для іх прэзыдэнцкім указам, прадэманстравала, што культываваны рэжымам страх беларусы могуць пераадолець.

---

## АФІЦЫЙНА

### У Беларусі ствараецца Дэпартамэнт па ядзернай і радыяцыйнай бясьпецы

**Дэпартамэнт па ядзернай і радыяцыйнай бясьпецы ствараецца Міністэрствам па надзвычайных сытуацыях Беларусі. Ён будзе кантраляваць ход будаўніцтва й эксплюатацыі беларускай атамнай электрастанцыі.**

Ужо пачаўся падбор адмыслоўцаў для новай структуры. Яе штат будзе невялікім – усяго 32 чалавекі. У пэрспэктыве па ўзгадненьні з МАГАТЭ беларускіх адмыслоўцаў чакае стажыроўка на атамных электрастанцыях у Расеі і Украіне.

## ПАЛІТЫКА

### Дзень абароны правоў чалавека ў Беларусі

**10 сьнежня – Усясьветны дзень абароны правоў чалавека. Беларускія праваабаронцы заклікалі Раду бясьпекі ААН зноўку разгледзець сытуацыю з парушэньнем правоў чалавека ў Беларусі.**

„Мы заклікаем краіны, якія зьяўляюцца пастаяннымі чальцамі Рады бясьпекі ААН, асабліва кіраўніцтва Расейскай Фэдэрацыі, пачаць ізноў разглядаць праблемы, зьвязаныя з парушэньнем правоў чалавека ў Беларусі”, – напісана ў заяве праваабаронцаў.

Заява выдадзена Грамадзкай камісіяй па рэабілітацыі ахвяраў палітычных рэпрэсіяў.

## АПАЗЫЦЫЯ

### Зьміцер Хведарук моцна зьбіты

**Ёсьць ахвяры акцыі-пратэсту супраць прыезду ў Менск расейскага прэзыдэнта Ўладзімера Пуціна. Акцыя прайшла 12 сьнежня на Кастрычніцкім пляцы ў 18 гадзінаў.**

Удзельнікі пратэсту былі жорстка зьбітыя спэцназам. Чэрапна-мазгавую траўму й вострую траўму жывата атрымаў моладзевы актывіст Зьміцер Хведарук, які

цяпер знаходзіцца ў 9-м клінічным шпіталі Менску. У аддзяленьні, дзе знаходзіцца малады чалавек, дзяжураць міліцыянты.

Ініцыятарам акцыі выступіў намесьнік старшыні Партыі БНФ Віктар Івашкевіч. Ён заклікаў ўсіх прыхільнікаў свабоды, незалежнасьці і эўрапейскага выбару Беларусі выйсьці на Кастрычніцкую плошчу зь бел-чырвона-белымі і эўрапейскімі сьцягамі.

## ГРАМАДЗТВА

### Мікалай Чаргінец супраць Аляксандра Тамковіча

**Першае судовае паседжаньне ў справе нібыта паклёпу на старшыню афіцыйнага Саюзу пісьменьнікаў Беларусі Мікалая Чаргінца з боку журналіста незалежнага выданьня „Новы час” Аляксандра Тамковіча пачнецца 19 сьнежня. Мікалай Чаргінец абвінавачвае журналіста ў паклёпе й абразе яго годнасьці на старонках газэты.**

За нанясеньне маральнай шкоды Мікалай Чаргінец патрабуе ў журналіста 100 мільёнаў рублёў, а ў газэты „Новы час” – 500 мільёнаў. Спадар Чаргінец лічыць, што вялікая сума кампэнсацыі паўстрымае спробы іншых журналістаў яго абразіць.

Старшыня праўладнага Саюзу пісьменьнікаў Беларусі заявіў, што, калі суд прызнае ягоную рацыю, атрыманыя сродкі ён перадасьць адной з псыхіятрычных клінікаў у Беларусі.

## ЭКАНОМІКА

### Расея прапануе Беларусі газ па 165 даляраў за тысячу кубамэтраў

**Расея прапануе Беларусі ў 2008 годзе газ па 165 даляраў за тысячу кубамэтраў. Гэта вынік праведзеных у Маскве перамоваў паміж старшынём праўленьня “Газпраму” Аляксеем Мілерам і першым намесьнікам прэм’ер-міністра Беларусі Ўладзімерам Сямашкам.**

Пра гэта паведамляе агенцтва “Інтэрфакс”, спасылаючыся на верагодную ананімную крыніцу. Беларускі ўрад прапаноўваў “Газпраму” цану 119,5 даляраў за тысячу кубамэтраў, і таму перамовы скончыліся безвынікова.

Для прыкладу, Украіна ўжо падпісала з “Газпрамам” пагадненьне пра пастаўкі газу ў наступным годзе. Яго цана складзе 179,5 даляраў за тысячу кубамэтраў. Цяпер украінцы плацяць 130 даляраў, Беларусь жа плаціць 100 даляраў за тысячу кубамэтраў расейскага газу.

## КУЛЬТУРА

### Мэдаль Кірылы Тураўскага для Янкі Запрудніка

**Вядомы беларускі эмігрант, гісторык і навуковец Янка Запруднік адзначаны мэдалём Кірылы Тураўскага. Узнагароду прызначае Мітрапаліт Менскі й Слуцкі, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Філярэт за ўнёсак у разьвіцьцё хрысьціянства ў Беларусі.**

Рашэньне было прынята яшчэ ў сярэдзіне лістапада, але вядома пра гэта стала толькі цяпер.
Мітрапаліт Філярэт адзначыў Янку Запрудніка за дапамогу ў будове царквы сьвятой Эўфрасіньні Полацкай у Івянцы. Янка Запруднік зь сям’ёй ужо шмат гадоў жыве ў Амэрыцы, аднак безупынна спрыяе духоўнаму й нацыянальнаму адраджэньню Беларусі.

Існуе шмат сайтаў, прысьвечаных падзеям у Беларусі, аднак яны малавядомыя ў Заходняй Эўропе, асабліва тым, хто займаецца фармаваньнем палітыкі адносна Беларусі й ня ведае беларускай ды расейскай моваў.

Сэрвіс belarus-live запаўняе гэты прагал. Штотыднёвую рассылку на ангельскай, польскай, беларускай ды расейскай мовах можна замовіць на сайце.